алімпіец
ЗВЯЗДА
ВЫПУСК № 8 (45)
Сумесны праект газеты «Звязда», Нацыянальнага алімпійскага камітэта і Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь

ЯШЧЭ АДЗІН МЕДАЛЬ

Джавід Гамзатаў стаў бронзавым прызёрам у грэка-рымскай барацьбе (катэгорыя да 85 кг)

На турніры ў Бразіліі 26-гадовы беларус пачаў выступленне з 1/8 фіналу, там ён перамог кітайскага спартсмена Пен Фея — 4:0. У паядынку за выхад у паўфінал Джавід не пакінуў шанцаў прадстаўніку Аўстрыі Амеру Хрустановічу — 9:0. А вось у барацьбе за выхад у фінал Гамзатаў не змог адолець украінскага спартсмена Жана Беленюка, саступіўшы 0:6.

Галоўны трэнер нашай зборнай па грэка-рымскай барацьбе Ігар Пятрэнка пазней скажа, што фінальны паядынак у яго падапечнага проста адабралі.

— *Перад схваткай за выхад у фінал загадзя прызначылі балгарскага арбітра, які быў зацікаўлены ў зыходзе паядынку на карысць саперніка беларускага атлета. Перамогу ў паўфінальным паядынку ў нас проста адабралі. Хачу задаць пытанне судзейскаму корпусу: як такое магчыма на Алімпіядзе?* — цытуюць СМІ Ігара Пятрэнку.

Нягледзячы на гэта, на паядынак за «бронзу» Джавід Гамзатаў выйшаў настроеным на перамогу. З самага пачатку наш барэц захапіў ініцыятыву і павёў 2:0. У далейшым перавага Гамзатава таксама не выклікала сумненняў, у выніку ён упэўнена давёў сустрэчу да перамогі — 4:1.

— *Ехаў у Рыа за медалём,* — кажа Джавід. — *Расчараваны, што не змог пазмагацца за «золата». Лічу, што ў паядынку супраць украінца Жана Беленюка была судзейская памылка, якая не дазволіла мне пазмагацца за вышэйшую ўзнагароду Алімпійскіх гульняў. На схватку за трэцяе месца выходзіў упэўнена і ведаў, што паспрабую не падвесці ўсіх сваіх заўзятараў.*

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Джавіда Гамзатава з заваяваннем бронзавага медаля Алімпіяды 2016 года.

«Ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі з боку сапернікаў ты праявіў высокае спартыўнае майстэрства, жалезны характар і волю да перамогі. Твой медаль — вельмі важнае дасягненне для беларускай школы барацьбы, якое дорыць надзею тысячам беларускіх хлопчыкаў, якія займаюцца гэтым сапраўды алімпійскім відам спорту», — гаворыцца ў віншаванні.

ЗША і Кітай лідзіруюць, але...

На Алімпіядзе-2016 ёсць і экзатычныя краіны, якія ўжо заваявалі медалі

Гэтыя кропкі зямнога шара ніколі не вылучаліся поспехамі на сусветных спартыўных арэнах, але сціплай хадой яны ўжо набліжаюцца да алімпа. Мы раскажам не пра лідараў медальнага заліку — ЗША, Кітай і Вялікабрытанію, а пра малавядомыя ў спартыўным свеце краіны, якія маюць у сваёй скарбонцы алімпійскія медалі.

Філіпіны

Філіпіны ўпершыню паўдзельнічалі ў летніх Алімпійскіх гульнях у далёкім 1924 годзе ў Парыжы і з тых часоў не прапусцілі ніводнай летняй Алімпіяды, акрамя Гульняў у Маскве ў 1980 годзе. Атлеты Філіпінаў да Гульняў-2016 заваявалі 9 алімпійскіх узнагарод: 2 сярэбраныя і 7 бронзавых. На п'едэстал філіпінцы падымаліся ў спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы, плаванні і боксе. Сёлета да вышэйзгаданага камплекта дадалася яшчэ адна ўзнагарода, яе здабыла цяжкаатлетка Хідылін Дыяс, якая выйграла «серабро».

Малайзія

Малайзія дэбютавала на Алімпійскіх гульнях крыху пазней — у 1964 годзе. І таксама, як і Філіпіны, не прапускала Гульні, за выключэннем маскоўскіх. Спартсмены гэтай краіны ніколі не прымалі ўдзел у зімовых Алімпіядах, а на летніх за ўсю гісторыю заваявалі 6 узнагарод.

У Бразіліі ўжо паспелі вызначыцца Чэонг Юн Хунг і Пандэлела Рынонг, на іх рахунку сярэбраныя алімпійскія ўзнагароды па скачках у ваду.

Манголія

Манголія ўпершыню прыняла ўдзел у Алімпійскіх гульнях у 1964 годзе. З тых часоў краіна ўдзельнічала ва ўсіх летніх Алімпійскіх гульнях, акрамя Алімпіяды-1984, калі падтрымала байкот, прапанаваны СССР.

У Бразіліі на рахунку мангольскай зборнай ужо ёсць адна сярэбраная ўзнагарода, яе для сваёй каманды заваявала дзюдаістка Сумія Даршурэн у катэгорыі да 57 кг.

■ Легенды спорту

Міхаіл ЗАХАРАЎ:

«Я прыйшоў працаваць, калі лёд чысцілі ўручную»

Пра самыя яркія моманты сваёй кар'еры і перспектывы нашай зборнай на алімпійскай кваліфікацыі

Фота Надзеі БУЖАН.

Міхаіл Захараў у беларускім хакеі асоба неардынарная. Хтосьці яго недалюбліваe за шчырасць, рэзкую пазіцыю і адкрытую крытыку. Камусьці такая імпульсіўнасць, насупраць, сімпатызуе. Але лепш за ўсё, як і пра кожнага чалавека-прафесіянала, пра яго кажуць дасягненні.

Кар'еру гульца Міхаіл Міхайлавіч скончыў вымушана, гэта адбылося з-за сур'ёзнай траўмы. Практычна адразу ён распачаў трэнерскую дзейнасць і на настаўніцкай сцежцы — вось ужо 20 гадоў. Гэта стала добрай нагодай пагаварыць з адным з найлепшых хакейных трэнераў краіны пра яго шлях, мары і ўвогуле хакей.

— Міхаіл Міхайлавіч, як пачалася ваша трэнерская работа?

— Калі я быў гульцом, перажыў цяжкую траўму — шайба трапіла ў галаву. Арганізм стаў па-іншаму ўспрымаць нагрузкі, таму працягваць выступаць на ранейшым узроўні я ўжо не мог. Былі нядрэнныя прапановы з Расіі, але пасля чэмпіянату свету вырашыў завяршыць гульнявую кар'еру.

І другая, і трэцяя беларуская каманда ў КХЛ мінскаму «Дынама» не патрэбныя, але асабіста я дзеля гэтай ідэі пацярплю яшчэ год-два, можа, тры.

— Памятаеце, як прайшла першая трэніроўка ў новай ролі?

— Вядома! Калі гаварыць па шчырасці, першае, што я падумаў, — гэта «якія ж слабыя хакеісты». З імі сталі адразу працаваць над «фізухай», таму што з гэтым былі сапраўдныя праблемы.

— Хутка адчулі ўпэўненасць на новай пасадзе?

— Вядома, прыйшлося перастройвацца, не схаваю, было цяжка. Да таго ж наш хакей быў тады ў жахлівым стане. На катку ў Парку Горкага ў нас не было заліваль най машыны. Дакладней, яна стаяла на складзе і нам яе проста не давалі, таму лёд чысцілі ўручную. У той час я і падумаць не мог, што нашы хакеісты калі-небудзь будуць гуляць на Алімпійскіх гульнях.

— Усе адразу ўспрымалі вас сур'ёзна?

— Так, выконвалі ўсе практыкаванні без пярэчанняў. Трохі «пазвяздзіць» маглі толькі маладыя Міша Грабоўскі і браты Касціцыны. Яны і сёння ўспамінаюць, што я мог з-за гэтага пагаварыць з імі ў грубай форме, а вось мне не хацелася б гэта ўзгадваць. Хоць цяпер хлопцы самі адзначаюць, што з іх не атрымаліся б класныя хакеісты, калі б я так сябе не паводзіў. Нягледзячы на ўсё, мы з імі захавалі выдатныя адносіны.

— Для вас сярод трэнерскага цэха ёсць аўтарытэты?

— Наогул я самавучка, але шмат чытаю Юрыя Ніканава і Анатоля Тарасава. Сваім настаўнікам назаву і Уладзіміра Крыкунова. У яго я пераняў падыход у працы на зямлі: трэніроўкі да знямогі ў летнюю пару, заняткі ж на лёдзе, наадварот, не павінны быць доўгімі, але інтэнсіўнымі і з барацьбой.

— Дзе знаходзіце матывацыю, каб кіраваць клубам на працягу дзесяцігоддзя?

— Хакей у чэмпіянаце Беларусі ў 2003 годзе і зараз — не адно і тое ж. Раней мы маглі прайграць «Віцебску» і «Брэсту», хоць «Юнацтва-2003» мацнейшае за цяперашняе ў два разы. Тады ў нас гулялі Андрэй Расолька, Алег Мікульчык, Сяргей Ярковіч, Сярога Шыткоўскі, Ілья Бякін, Юрый Івашын.

Сёння наш хакей валіцца ў прорву. Калі вы паставіце мне задачу выйграць у «Брэста» з лікам 15:0, то мы зробім гэта. Скажыце, што трэба два матчы выйграць, мы зноў выйграем.

— Вас даволі часта крытыкуюць заўзятары, як да гэтага ставіцеся?

— Раней у мяне быў клубны аператар, які любіў выбраць самыя непрыемныя водгукі з форумаў. Я з павагай іх чытаў. Гэта было на Алімпіядзе ў Ванкуверы. Цяпер за гэтым больш не сачу. Калі мяне нехта абражае, нічога страшнага — перажыву. Перш за ўсё, ведаю, як да мяне ставяцца хакеісты. Для мяне гэта самае галоўнае. Павага, напрыклад, Шэлега і Калюжнага — гэта вельмі важна.

— Міхаіл Міхайлавіч, пра што вы марыце?

— Усе, напэўна, ведаюць. Не хацелася б лішні раз гаварыць на гэтую тэму, таму што зноў народ стане крывіцца, а вялікія кіраўнікі нашага хакея — нервавацца.

Прыйдзе час, калі ўсе зразумеюць: з адной камандай у КХЛ мы нічога не зробім. На чэмпіянатах свету наша зборная змагаецца за дванаццатае, трынаццатае, чатырнаццатае месцы — а там ужо і вылет з элітнага дывізіёна. Нічога, пройдзе алімпійская кваліфікацыя і яшчэ адзін чэмпіянат свету — і людзі зразумеюць, што я меў рацыю.

І другая, і трэцяя беларуская каманда ў КХЛ мінскаму «Дынама» не патрэбныя, але асабіста я дзеля гэтай ідэі пацярплю яшчэ год-два, можа, тры. А потым, дарэчы, Расія нас можа ўжо не пусціць да сябе. Кітайцы ў гэтым годзе зайшлі ў лігу адной камандай. Наколькі я ведаю, з наступнага года казахі паспрабуюць заявіць другі свой калектыў.

— Што скажаце пра чэмпіянат Беларусі?

— Ён павінен быць, але толькі ў варыянце маладзёжнага першынства, накшталт АХЛ.

— Які момант у сваёй кар'еры назвалі б самым паспяховым?

— Дрэнныя я не памятаю, а што датычыцца добрых успамінаў, то назаву Алімпійскія гульні ў Ванкуверы, дзе працаваў са зборнай у якасці галоўнага трэнера. Калі ўспомніць пра кар'еру гульца, то ў ёй галоўныя дасягненні выпалі на той момант, калі я выступаў у складзе маладзёжнай зборнай СССР.

— Чаго вы чакаеце ад удзелу «Юнацтва» ў Лізе чэмпіёнаў?

— Хацелася б годна згуляць, адчуць гэты турнір. Кантынентальны кубак мы ж таксама не з першага разу выйгралі! Не ведаю, колькі ўсяго разоў гулялі ў ім. Даходзілі то да фіналу, то да паўфіналу. А потым два разы забіралі трафей сабе.

— Зараз Беларусь прэтэндуе на правядзенне ў 2021 годзе чэмпіянату свету. Як лічыце, ці ёсць у нас шанцы?

— Гэта неалімпійскі год, можа, ён нам і не патрэбны. Я так разумею, мы проста закідваем вуду, каб атрымаць чэмпіянат 2022 года. Самі разумееце, атрымаць першынства свету ў год Алімпіяды будзе прасцей. Даю дзвесце працэнтаў, што ЧС-2022 нам аддадуць. Усе ведаюць, як добра мы справіліся з першым чэмпіянатам у 2014 годзе, пра што паўтараў і прэзідэнт ІІХФ Рэнэ Фазель. З другім мы справімся значна лепш, чым у мінулы раз.

— Як лічыце, наша зборная зможа заваяваць пуцёўку на Алімпіяду ў Пхёнчхан?

— Шчыра, я за зборнай не сачу. Прыходжу на матчы толькі для таго, каб паглядзець гульню, пахварэць за сваіх выхаванцаў і Радзіму. Шанцы на поспех — пяцьдзясят на пяцьдзясят.

Біяграфічная даведка

Міхаіл Міхайлавіч Захараў нарадзіўся 22 студзеня 1962 года ў Усць-Каменагорску. У мінулым савецкі і беларускі хакеіст, галоўны трэнер мінскага хакейнага клуба «Юнацтва». Заслужаны трэнер Беларусі. Майстар спорту СССР міжнароднага класа.
Трэнерскую кар'еру пачаў у спартыўнай дзіцяча-юнацкай школе алімпійскага рэзерву «Юнацтва» (з 1996 па 2003). Трэніраваў зборную Беларусі з 1996 па 2001 год. Галоўным трэнерам ХК «Юнацтва-Мінск» з'яўляецца з 2003-га па цяперашні час.
Дасягненні ў трэнерскай дзейнасці:
пераможца чэмпіянату свету ў першым дывізіёне (2004);
пераможца чэмпіянату свету сярод маладзёжных каманд у першым дывізіёне (2003);
пераможца чэмпіянату свету сярод юніёрскіх каманд у першым дывізіёне (2001);
чэмпіён Беларусі (2004, 2005, 2006, 2009, 2010, 2011);
сярэбраны прызёр чэмпіянату Беларусі (2008);
бронзавы прызёр чэмпіянату Беларусі (2007);
уладальнік Кубка Беларусі (2005, 2009, 2010).

■ Па-за гульнёй

ZTE ЗА «КРУМКАЧОЎ»

Кітайская кампанія стала новым партнёрам сталічнага футбольнага клуба

Лагатып ZTE на форме мінскай каманды з'явіўся яшчэ 31 ліпеня, калі «Крумкачы» ў Мінску абыгралі «Белшыну», а крыху пазней аб супрацоўніцтве клуба і буйной кампаніі было абвешчана афіцыйна.

— *Вядома, мы рады магчымасці партнёрства з такой вядомай міжнароднай кампаніяй,* — **адзначыў Дзяніс Шунто, старшыня праўлення футбольнага клуба «Крумкачы».** — *Будзем імкнуцца да развіцця супрацоўніцтва, нашы каманды па маркетынгу ўжо пачалі актыўную працу над ідэямі па сумесным прасоўванні.*

— *Нам будзе прыемна падтрымаць гэты цікавы праект, «Крумкачы» вельмі хутка развіваюцца,* — **адзначыў у сваю чаргу дырэктар ZTE Тан Лухаа**. — *І самі спартсмены, і заўзятары гэтай каманды — маладыя і сучасныя жыхары Беларусі, адкрытыя да выкарыстання інавацыйных тэхналогій, і мы спадзяёмся, што ў гэтым сэнсе глядзім у адным кірунку з вашым клубам.*

Карпарацыя ZTE — кітайскі вытворца тэлекамунікацыйнага абсталявання. Асартымент прадукцыі ахоплівае практычна кожны сектар рынка правадной і бесправадной сувязі, мабільных і фіксаваных тэрміналаў. Карпарацыя ZTE была заснавана ў 1985 годзе ў Кітаі, горадзе Шэньчжэне, дзе і сёння размешчана яе штабкватэра.

■ Каб помнілі

ТАЛЕНТ І ТРАГЕДЫЯ ПРАКОПА

Гісторыя яркага, але кароткага жыцця самага народнага футбаліста краіны

Яго жыццёвы шлях пачаўся ў Бабруйску, там ён нарадзіўся і стаў гуляць у футбол, ужо ў школе пачалі прыходзіць першыя спартыўныя поспехі. Дзіцячая каманда роднага горада адкрыла Аляксандру Пракапенку шлях у вялікі футбол. У 1971 годзе адбылася першая значная падзея ў футбольнай кар'еры — галоўны трэнер бабруйскага «Будаўніка» Генадзь Штэйнбук далучыў Пракапенку да трэніровак дарослай каманды, хоць хлапчуку яшчэ не было і 18-ці. Неўзабаве юнага паўабаронцу паклікалі ў Магілёў, з гэтага моманту ў яго кар'еры наступіў сапраўдны прарыў.

Настаўнікаў заўсёды падкупляла неверагодная працаздольнасць, прастата і хуткасць, якую дэманстраваў Аляксандр, таму нядзіўна, што гэтага хлопца заўважылі і ў вядучым клубе рэспублікі — мінскім «Дынама». Ён трапіў туды ў ліпені 1972-га і хутка зайграў у асноўным складзе.

— *Пракоп уліўся ў калектыў. Пару матчаў згуляў у «дублі», затым перайшоў у асноўны склад. На мой погляд, футбольнай школы ў яго не было, але гэта быў свайго роду самародак, — успамінае* ***калега футбаліста Уладзімір Курнеў.***

Футбол як мастацтва

Ужо ў наступным сезоне Пракапенка стане самым выніковым гульцом сярэдняй лініі, а потым і ўсёй мінскай каманды. Пракоп, так клікалі яго ў калектыве, выконваў велізарны аб'ём работы. Ён вылучаўся фенаменальным пачуццём пазіцыі, чытаў гульню, і галоўнае — заўсёды мог апынуцца ў патрэбную секунду ў патрэбнай кропцы поля.

Хуткі, спрытны і тэхнічны, Пракапенка пастаянна знаходзіўся ў руху, кажуць, яго футболка ў гульні ніколі не была сухой. Аляксандр усё выконваў на высокай хуткасці, умела ўзаемадзейнічаў з партнёрамі, заражаў іх сваім азартам і вызначаўся арыгінальнымі гульнявымі рашэннямі. І партнёры па камандзе, і заўзятары ведалі — Аляксандр хутчэй памрэ, чым спыніцца гуляць з-за стомы ці ляноты.

Зорны час Пракапенкі надышоў пасля прыходу да руля мінскага «Дынама» Эдуарда Малафеева. Талент гульца заззяў новымі гранямі, таму што Эдуард Васільевіч сам вітаў нестандартнасць.

— *Яго немагчыма было не любіць,* — успамінае **Малафееў.** — *Гэта быў вельмі лагодны і сімпатычны ва ўсіх адносінах чалавек. Чалавек, які апошняе мог з сябе зняць і аддаць. Апошнім кавалкам хлеба і адзеннем падзяліўся б. Ён быў адным з лепшых прадстаўнікоў не толькі беларускага, але і савецкага футбола. Вельмі сумленны чалавек, яму было соромна гуляць дрэнна. Хто ў тыя залатыя для «Дынама» часы быў самым працавітым на полі? Пракапенка! Ён умеў цярпець, ён працаваў на трэніроўцы так, як ніхто.*

У 1982 годзе мінскае «Дынама» трыумфальна выйграла чэмпіянат Саюза. Гэта і было часам Аляксандра Пракапенкі, да якога ён ішоў некалькі гадоў.

«Ну што, Сашок, па маленькай?»

Пасля з'яўлення Пракапенкі ў Мінску яго папулярнасць стала расці і па-за межамі поля. Сталічны глядач прыняў «навічка» і вельмі палюбіў, як скажуць пазней, магчыма, менавіта глядач яго і загубіў... Сам Аляксандр з-за сваёй прыроднай сціпласці прасіў начальніка каманды не браць яго на ўсялякія сустрэчы з заўзятарамі, ведаючы, што большая частка пытанняў будзе адрасавана менавіта яму. Да таго ж Пракапенка заікаўся, таму адчуваў пры вялікай аўдыторыі сябе некамфортна. Аляксандр практычна не даваў інтэрв'ю, а вось у нефармальнай абстаноўцы меў зносіны лёгка.

Хутка стануць пагаворваць пра цягу Пракопа да алкаголю, а потым яго залежнасць ужо перастане быць сакрэтам.

— *Легендарны ён быў чалавек, хоць і слабахарактарны,* — успамінае **футбаліст Юрый Пудышаў**, капітан «Дынама» ў 1982 годзе. — *Вось ён заходзіць у рэстаран паабедаць, і абед пераходзіць у цяжкую вячэру. За кожным сталом яго пазнавалі і запрашалі «выпіць 50 грамаў». Тут пакаштаваў, там пакаштаваў...*

Ён проста знікаў

Таленту і выступленням Аляксандра шкодная звычка замінала ўсё больш. Пракапенка пачынаў знікаць: то са збораў, то проста па дарозе з цягнікоў, то ўвогуле не прыходзіў на трэніроўкі. Начальнік каманды і адміністратар збіваліся з ног, шукаючы гульца, з якім увесь час здараліся дзіўныя гісторыі. Ён заходзіў у кафэ, нібыта аддаць доўг, і не вяртаўся па некалькі гадзін, на чыгуначнай станцыі выходзіў купіць вады і спазняўся на цягнік, а потым вяртаўся з Масквы трое сутак.

Такія знікненні звычайна заканчваліся вяртаннем і пакаяннем. Кажуць, уся каманда любіла гэты спектакль. Калі сітуацыя заходзіла ў тупік, Пракапенка адклікаў кагосьці з футбалістаў і прасіў: «Ты ж ведаеш, як я люблю футбол... Будзе сход, ты скажы, што давайце самы апошні раз прабачым яму». Так было не раз, трэнеры яму прабачалі, бо Аляксандр — бліскучы футбаліст, добры чалавек. Пракапенка выкупляў сваю віну неверагоднай аддачай на полі, і трэба сказаць, трэнеры пра тое ведалі і гэтым карысталіся.

Бывала і такое, што ў якасці пакарання Аляксандра выганялі з каманды, бо ўсім было вядома, як ён мучыўся без футбола, без яго ён проста не мог жыць. Тады Пракоп пачынаў трэніравацца самастойна, бегаць кросы, але яго адлучкі станавіліся ўсё больш працяглымі. Чарговы раз з «Дынама» яго выгналі ў 1983-м. Рашэнне было канчатковым, Аляксандр пакінуў клуб назаўжды.

Пракапенка паспеў пагуляць і за зборную СССР на маскоўскай Алімпіядзе. У тым складзе ён стаў адзіным прадстаўніком мінскага «Дынама». Беларус згуляў у двух першых матчах, потым сарваўся, і Канстанцін Бескаў, які тады кіраваў камандай, пазбавіў яго права працягваць гуляць. Пытанне стаяла і аб пазбаўленні Пракапенкі алімпійскай «бронзы», але тады ўсё абышлося.

Далей — самы страшны перыяд

У канцы 1984 года Аляксандра змясцілі ў Мазырскую лячэбна-працоўную ўстанову, ён ведаў сваю праблему і, безумоўна, хацеў з ёй змагацца. У ЛПП выдатны футбаліст правёў цэлы год, там ён працаваў у цэху, дзе рабілі ланцугі. Ставіліся да Аляксандра, вядома, добра, давалі нават трэніравацца з мячом. Але, каб канчаткова не страціць у сабе футбаліста, яму неабходна было вяртацца на волю.

Пракапенка пачаў падшукваць хоць нейкі варыянт, дзе можна было б працягнуць кар'еру, згодай адказаў толькі магілёўскі «Днепр». Згуляўшы там 15 матчаў, Пракоп зноў знік... А праз нейкі час жонка моўчкі здала яго форму.

Чэмпіёны! Мінскае «Дынама». 1982 год.

Апошнім клубам у яго кар'еры стаў «Нефтчы», у якім футбаліст правёў пяць гульняў, але гісторыя са знікненнямі ў Баку прадоўжылася і скончылася гэтак жа, як і папярэднія.

Раніцай 29 сакавіка 1989 года Аляксандр быў цвярозы і казаў, што ўсё цяпер пойдзе па-іншаму. Увечары ён з'явіўся ў рэстаране гасцініцы «Мінск», як звычайна нікога не крыўдзячы, пераходзіў ад аднаго століка да другога. Потым выйшаў з залы і накіраваўся ў бок туалетаў і гардэроба. Праз хвіліну ў залу ўбегла спалоханая афіцыянтка і паведаміла: «Пракапенку дрэнна!» Супрацоўнікі і наведвальнікі акружылі футбаліста, які ляжаў на падлозе, а брыгада «хуткай дапамогі» паспела толькі канстатаваць смерць.

Сёння існуюць дзве версіі прычыны смерці Аляксандра. Першая — асфіксія, менавіта яе і аб'явілі тады грамадскасці, маўляў, у горле затрымаўся кавалак мяса. Другая — у Пракапенкі проста не вытрымала сэрца.

Кажуць, праводзіць любімца футбольнай публікі ў апошні шлях выйшла ўся мужчынская частка Бабруйска, дзе пахавалі Аляксандра Пракапенку.

Памяць

У вялікага футбаліста засталіся жонка Наталля і сын Дзмітрый. Цяпер яны жывуць у ЗША, але час ад часу прыязджаюць на радзіму.

— *Калі прылятаю ў Мінск, мне расказваюць пра бацьку анекдоты або гісторыі з яго жыцця. Неяк у таксі пад'язджаем да нашага дома на Маякоўскага, а кіроўца кажа: «Вось, а ў гэтым доме калісьці жыў знакаміты беларускі футбаліст Аляксандр Пракапенка». Я толькі ўсміхаюся, — расказаў Дзмітрый.*

Ён, як і бацька, займаўся футболам, але вырашыў не звязваць з ім сваю прафесійную дзейнасць. Цяпер у Дзмітрыя маса праектаў, якімі ён хоча ўвекавечыць памяць знакамітага бацькі

Біяграфічная даведка

Аляксандр Цімафеевіч Пракапенка нарадзіўся 16 лістапада 1953 года ў Бабруйску. Гульнявое амплуа — паўабаронца. Майстар спорту СССР (1979). Майстар спорту міжнароднага класа (1980). У «Дынама» (Мінск) гуляў з ліпеня 1972 года. У 1983-м быў адлічаны з каманды за сістэматычнае парушэнне рэжыму. Гуляў за «Днепр» (Магілёў) — 1986 (па чэрвень), «Нефтчы» (Баку) — 1987 (па красавік). У зборнай СССР (1980) правёў 1 матч; у алімпійскай зборнай СССР (1980) — 2 гульні.
ДАСЯГНЕННІ:
чэмпіён СССР 1982;
у спісе 33 лепшых футбалістаў СССР — № 1 (1982);
бронзавы прызёр АГ 1980 года.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by